*Л.Г.Кісялёва*

# Нараталогія як кірунак культуралагічных даследаванняў

Нараталогія (тэорыя аповеду) як кірунак у літаратуразнаўстве ператварылася ў цэлую сферу даследаванняў у самых розных галінах, у тым ліку ў культуралогіі. Такое разгортванне даследчай прасторы нараталогіі з'яўляецца адной з праяў агульнай тэндэнцыі, якая вызначылася ў 80-я гг. XX ст., — тэндэнцыі да пашырэння тэарэтычнага дыскурсу, метадалагічнай базы літаратуразнаўства на іншыя гуманітарныя дысцыпліны. І не толькі адной з праяў, але і адной з фундаментальных падстаў такога пашырэння, бо ў інтэрдысцыплінарным разуменні нараталогія якраз і даводзіць, што практычна любая культурная з'ява ствараецца і дзейнічае па тых жа мадэлях і законах, што і літаратурны аповед. (Адсюль вынікае, што для даследавання любой культурнай з'явы цалкам прыдатныя і дастатковыя літаратуразнаўчыя метады і катэгорыі.)

Р.Барт, адзін з заснавальнікаў нараталогіі, патлумачыў, як трэба разумець паняцце "наратыў" (аповед): "У свеце існуюць незлічоныя формы наратыву… Сярод рэсурсаў наратыву — вербальнае выказванне ў вуснай ці пісьмовай форме, карціны, статычныя ці рухомыя, жэсты; і ва ўпарадкаваным змяшэнні гэтых субстанцый наратыў выкарыстоўваецца ў міфах, легендах, байках, казках, кароткіх апавяданнях, эпічных творах, гісторыях, трагедыі, драме, камедыі, пантаміме, малюнках, каляровых вітражах, кіно, мясцовых навінах, размовах; сапраўды, наратыў пачынаецца з самой гісторыі чалавецтва; не існуе, ніколі нідзе не існавала людзей без наратыву… Як само жыццё, ён тут, міжнацыянальны, трансгістарычны, транскультурны" [1]. У апошнія дзесяцігоддзі гэтае "як само

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

жыццё" ў дачыненні да наратыву ўсталявалася не ў якасці метафары, але аксіёмы замест "як" ужо пастаўлены працяжнік: наратыў як універсальная эпістэмалагічная форма, як адзіны спосаб асэнсавання, засваення свету чалавекам (Ф.Джэймісан); чалавечая асоба як аўтаапавяданне, наратыў як форма самаафармлення асобы (Б.Слугоскі, Дж.Гінзбург); апавядальная прырода чалавечых паводзін і свядомасці (наратыўная псіхалогія) [2], гісторыя чалавецтва як сукупнасць наратываў [3], міфалогія, рэлігія, навука як распавяданне гісторый; урэшце, увесь свет як бясконцы, бязмежны наратыў. Так ці інакш, але наўрад ці хто будзе аспрэчваць, што "кожная культура, пра якую мы ведаем, была культурай, якая распавядае гісторыі" (Й.Бракмэер і Р.Харэ) [4].

Аднак нараталогія — гэта не толькі тэарэтычная канцэпцыя, гэта і асаблівая методыка аналізу, якая выкарыстоўваецца ў літаратуразнаўстве і можа аказацца карыснай, напрыклад, у мастацтвазнаўстве.

Апавядальная прырода шэрага відаў мастацтва (тэатр, кіно, балет і інш.) відавочная. У іншых (візуальныя мастацтвы, музыка і г.д.) наратыўны складнік можа быць выражаны не так яскрава, але ігнараваць ці недаацэньваць яго не варта. І, напэўна, даследаванне наратыўнай сутнасці як пэўных відаў мастацтва, так і асобных твораў (мастацкі твор як распавяданне гісторыі) дазволіла б пашырыць магчымасці іх інтэрпрэтацыі. Тут можа быць выкарыстаны досвед літаратуразнаўчай нараталогіі, якая займаецца такімі пытаннямі, як вызначэнне істотных прымет наратыву, стварэнне яго фармальных універсальных мадэляў, "рэцэптаў наратыву", вывучэнне разнастайных наратыўных стратэгій, даследаванне наратыву з пункту гледжання камунікатыўнай прыроды мастацтва (з абгрунтаваннем шматлікіх "апавядальных інстанцый" у камунікатыўным ланцугу, па якім мастацкая

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інфармацыя перадаецца ад адпраўніка (аўтар) да атрымальніка (у дачыненні да літаратуры гэта чытач, у іншых відах мастацтва — глядач, слухач і г.д.).

Сярод "канвенцыянальных нормаў" стварэння наратыву ў першую чаргу даследуюцца суадносіны паміж фабулай і сюжэтам (ці гісторыяй і дыскурсам, ці гісторыяй, наратывам і нарацыяй і г.д.), спосабы падачы і размеркавання падзей у наратыве, у тым ліку пытанні прасторы, часу і інш., сукупнасць дзеючых асоб, іх наратыўныя ролі і функцыі, а таксама іх месца ў вышэйзгаданым камунікатыўным ланцугу.

---

1. *Цыт.* па: *Андреева К.* Текст-нарратив: опыт структурно-семантической интерпретации. — Тюмень, 1993. — С. 51.

2. *Больш* падрабязна гл.: *Ильин И.* Постмодернизм от истоков до конца столетия: эволюция научного мифа. — М., 1998. — С. 94 — 100.

3. *Больш* падрабязна гл.: *Филюшкин А.* «Постмодернистский вызов» и его влияние на современную теорию исторической науки // Топос. — 2000. — № 3. — С. 67—78.

4. *Брокмейер Й., Харре Р.* Нарратив: проблемы и обещания одной парадигмы // Вопросы философии. — 2000. — № 3. — С. 31.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Е.Э.Миланич*

## Ирония как способ мировосприятия в эпоху "серебряного века"

На рубеже XIX—XX вв. русская культура развивалась как в направлении все большей демократизации, так и в направлении элитарного отстранения от мира. Элитарная субкультура выразила себя в стилистических исканиях